ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

КІМ

Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

КОШТ НУМАРУ — 3 КАП. АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, КАМСАМОЛЬСКАЯ 25

№ 68 (303) Нядзеля, 13 чэрвеня. | Выходзіць тры разы на тыдзень: у чацьвер, пятніцу і нядзелю. | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 903 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, «Чырвоная Зьмена», Менск, Савецкая 63.

Каленым жалезам!

Адрыжкі мінулага, старога дзядоўскага: п'янка, дзябош „фізкультура" па «фізіі» сваіх блізкіх—усё гэта яшчэ канвульсыўна чапляецца за нашу моладзь, робіць патугі, каб зьвіць прытулак сярод нас.

У некаторай на шчасьце нязначнай частцы працоўнай моладзі асаблівым ганарамі «ўхарствам»—лічыцца—пахуліганіць і падзебашчырыць.

14 зьезд Усе КП па пытаньню аб комсамоле зьвярнуў асаблівую ўвагу на змаганьне за ўпарадкаваньне жыцьця і быту моладзі.

П'янства зьяўляецца адным з кепскіх бакоў бытавога жыцьця моладзі.

П'янства робіць горшым матар'яльнае становішча, зьніжае культурны ўзровень моладзі. Дзе п'янства, там хуліганства, растраты, прагулы і інш. П'янства разбурае малады організм.

Неабходна пачаць больш упартую барацьбу з п'янствам. Гэткія мерапрыёмствы, як: організацыя вечарын, організацыя разумнага свабоднага часу моладзі, прасоўваньне кніг, часопісаў і газэт ў масы моладзі, энэргічнае разьвіцьцё прац па фізычнай культуры, разьвіцьцё санітарнай асьветы, растлумачэньне прычын і значэньня выпуску «сорокаградусной», дадуць жаданыя вынікі ў справе барацьбы з п'янствам.

Аднэй з формаў барацьбы за культурны быт моладзі 7-ы зьезд комсамолу намеціў стварэньне гурткоў па барацьбе з алкаголізмам пры клюбах і падобных установах. Гэтыя гурткі неабходна як мага разьвіваць.

Комсамол—вораг п'янства. Комсамолец не павінен піць!

П'яніца не дапамагае будаваць нашу социялістычную гаспадарку, а наадварот дапамагае ворагам ставіць палкі ў калёсы социялістычнай прамысловасьці.

Аб комсамольцах—гаспадарах.

У нас маецца шмат комсамольцаў-гаспадароў дык таму здзіночак. Гэтыя комсамольцы выконваюць нараўне ячэйковыя абавязкі з рэштай больш свабодных комсамольцаў. Ці павінна так быць. Ці павінны яны нагружацца нараўне з другімі комсамольцамі. Так ня можа быць. Комсамолец гаспадар павінен быць прыкладным гаспадаром, ісьці наперадзе у справе гаспадаркі на зямлі. Але ці дае магчымасьць такое становішча комсамольцам-гаспадарам паставіць так працу у гаспадарцы. Ня дае. Ён часта з за комсамольскай працы у ячэйцы адстае ад рэшты селян на гаспадарцы. Ячэйкі малаж зьвяртаюць на гэта увагі. Ды й наогул праца з комсамольцамі-гаспадарамі яшчэ не прыняла у нас выразны характар. У нас няма у гэтым нічога, чым мы маглі б пахваліцца, й есьць неразуменьне ролі комсамольца—гаспадара у сельскай гаспадарцы, як передавога селяніна. У некаторых ячэйках існуе такая думка—ты комсамолец, выконвай абавязак у ячэйцы, а калі не, ты кепскі комсамолец. Гэта правільна, але гэта не павінна адносіцца да комсамольца-гаспадара.

Працу у гаспадарцы трэба лічыць як запраўды абавязак і ячэйцы трэба быць зацікаўленай у павышэньні комсамольцам свабоднай гаспадаркі. Дзеля гэтага нагрузка комсамольца-гаспадара павінна адрозьнівацца ад нагрузкі іншых комсамольцаў; справу трэба паставіць і увязаць так, каб комсамолец меў магчымасьць займацца свабоднай гаспадаркай. Трэба падумаць аб дапамозе комсамольцу у яго гаспадараньні. Райкомам трэба склікаць нарады комсамольцаў-гаспадароў, трэба пакланапіцца аб тавіх комсамольцы, каб селяне больш не тыкалі пальцамі—вось комсамолец-араты, агітуе за культурную гаспадарку, а у самога што робіцца.

Трэба даць комсамольцу-гаспадару больш магчымасьці займацца свабоднай гаспадаркай, паставіць яе на патрэбную вышыню.

К. Бразгуноў.

Новости вкратце.

○ Москва ежемесячно потребляет 90 тысяч пудов подсолнечного масла.

○ 599 газет насчитывается на территории СССР. Их тираж—8.281.820 экземпляров.

○ Букварь на цыганском языке будет выпущен к началу будущего учебного года.

○ Последний срок введения метрической системы в розничной торговле продлен до 1 июля.

○ 10 000 подростков-фабзавучников взяты под постоянное медицинское наблюдение.

○ 400 тысяч рублей собрано всеми московскими газетами в пользу беспризорных.

Даешь правду!

(От нашего корреспондента из Чехо-Словакии, получено на языке эсперанто).

Я с большой радостью для меня принимаю ваше предложение быть вашим постоянным корреспондентом. От вас я прошу только одного—правдивых писем о жизни вашей молодежи. Ведь у нас чего только не говорят о вашей стране? Сколько ужасов творится в ней по сообщениям буржуазных газет. И каждое ваше письмо будет открывать нам правду о СССР.

Мне 21 год—по профессии углекоп, работаю в шахте по 8 часов в сутки. Эти 8 часов работают 3 смены. Утром спускаемся в шахту в 6 часов утра—подымемся на верх в 2 часа. Вторая смена работает с 1½ часа до 9½ часов вечера и 3 ночная партия—с 9 ч. вечера до 5 часов утра. С 5 утра до 6 ч. шахта свободна. И так каждый день. Углекоп получает жалованья 35—40 крон. А 1 кило хлеба стоит 8—10 крон! Вот и живи.

Рабочий, если проработал на шахте 5 лет имеет право на 5—дневный отпуск; проработавший 7 лет получает отпуск на 7 дней и т. д.

Молодежь работает так же, как и все рабочие, никаких привиллегий ей нет. Работает в шахтах по 3—4, редко 5 дней в неделю. Вы спросите, почему не больше?

— А нам говорят так.—„Нет заказов на уголь". Но это ложь! Наглая ложь! Зачем тогда ввозят к нам уголь из Польши? В соседних городах и областях говорят, что мы не хотим работать! Это тоже ложь! Дайте нам работу и мы будем работать. Так буржуазия травит рабочих, сеет вражду между ними.

Когда английские товарищи забастовали капиталисты возрадовались и прибавили один день работы, но мы отказались в знак солидарности с английскими углекопами.

Инициатором в этом деле, как и везде, является наша рабочая молодежь. Бывшие у вас делегации много нового рассказали нам о вас.

Ваши письма которых мы ждем, расскажут нам о том, как нам надо работать, чтобы построить свою Чехо-Словацкую ССР.

Комсомольцы СССР, учите нас своими примерами!

Эмиль Климша.

Прим. ред: ответы тов. Климше пишите в редакцию.

Комсомольцев под арест.

(От нашего корреспондента из Вены, получено на международном языке эксперанто.)

Вена—большой город, разделенный на 21 округ.

Я живу во втором округе, где мы имеем свою комсомольскую организацию.

Комунистическое движение в Австрии пока еще слабо.

Компартия организована по районам. Через каждые три дня выпускается коммунистическая газета.

Теперь о молодежи. Наш комсомол количественно меньше союза „социалистического юношества". Социалистическая молодежь—это—„золотая молодежь". Для них союз— „это увеселительные места", с пьянкой, картами и танцульками и прочими „прелестями" буржуазного мира.

Наш комсомол и партия, понятно ведут борьбу против меньшевистских организаций.

В настоящее время я не могу быть активным, потому что за время тяжелой работы заболел туберкулезом в острой форме. Мы работаем почти нелегально. Аресты для нас не новинка. „Комсомольцев под арест"— вот лозунг нашего правительства.

„Социалистическая" молодежь помогает правительству преследовать наши организации.

К. Шайтгауэр

Смертные казни продолжаются.

АНГОРА. Военно-полевой суд в Дамаске (колония Франции) продолжает выносить смертные приговоры. На днях в Дамаске приговорены к смертной казни 49 человек.

Вести из Польши.

Кровавое столкновение.

ВАРШАВА. Из Львова сообщают о кровавом столкновении между сторонниками Бриля (крестьянская партия) с пястовцами на митинге, устроенном брилевцами. В результате столкновения 6 крестьян ранено, один убит.

Помещики преследуют крестьян.

ВАРШАВА. „Роботник" сообщает о вооруженных экспедициях помещиков, военных частей против крестьян в Войниче и Цыганках (Барановичский уезд). Такие же экспедиции, но в более широком масштабе организуются в Лошовском уезде.

Точка опоры.

Один из английских дредноутов отправлен в Египет для поддержки точки зрения Англии в Египте

Чемберлен.—Если имеешь хорошую точку опоры, то не трудно иметь и необходимую точку зрения.

Урожай будет не ниже среднего.

Все зависит от июньской погоды.

Состояние посевов в настоящий момент нельзя считать вполне обеспеченным. Но можно сейчас определить, что озимые дадут урожай не ниже среднего, а может быть и выше. Состояние ранних яровых на 1-ое июня расценивается несколько лучше, чем в прошлом году на те же число. Результаты будут зависеть от того, каков будет июнь. При наличии благоприятной погоды в июне можно ожидать, что валовой сбор будет приблизительно около прошлогодних размеров

О цветах и портянке.

... Когда на сцене смолкают последние звуки и онемевшая публика, после нескольких секунд грозового затишья, вдруг вспыхивает потным восторгом аплодисментов; когда на сцене смолкают последние звуки, и усталые артисты с улыбкой раскланиваются с желтой недосягаемости сцены; когда сотни людей партера и ярусов, которых так трудно привести в восхищение, неистовствуют, звенят и захлебываются в старенском крике „браво",—тогда, сквозь неизменно спокойные ряды кресел, несут цветы.

Цветы!.. Как бы они не явились розами-ли в дорогой корзинке, великолепная спинка которой представляет собой лиру, или скромными букетом влажной сирени, или отдельными разноцветными брызгами, летящими из всех уголков театра — они всегда волнующе радуют артистов. Цветы им говорят об уважении и любви публики, о том, что их искусство понимается и ценится...

В старое время преподнесение цветов заслуженным артистам было существеннейшей частью театрального церемониала.

В наши дни это бывает редко: цветы в опале.

И секретарь Червенской ячейки ЛКСМБ тов. Марон и его закадычный друг Малевич, будучи твердокаменными большевиками, со всею решительностью отвергали достоинство цветов

Что-ж, отвергали так отвергали! Но дело в том, что т. т. Марон и Малевич, свято памятуя о строительстве нового быта, пошли дальше. Они сделали первый в мире опыт нового оказания уважения артистам. И какой „гениальный" опыт!..

* * *

... Как всегда, маленькое помещение Червенского рабочего клуба наполнилось нетерпеливой, орущей и жующей публикой. Медлительно, как выполнение на местах указаний центра, раздвинулся занавес.

На сцене—хор слепых. Бледные люди, которые не видят солнца, весенних лиц, алый шелк развевающихся знамен, пели о солнце, весне и знаменах. Они пели с большим, радостным под'емом. Они пели так, именно потому, что хотели доказать что и слепые умеют вырвать из глубины человеческих сердец звонкие крики восторга. Бледные люди может никогда не видали цветов, но они их чувствовали. Чувствовали и ждали благодарности и уважения.

И... они не ошиблись.

В те несколько секунд грозового затишья, когда хор замолк и публика готова была разразиться аплодисментами, в темноте залы поднялась высокая фигура секретаря ячейки Марона, рука его сделала полукруг в воздухе и превосходнейший комсомольский букет в виде отвратительной, вонючей портянки полетел на сцену... Это Марон и Малевич произвели свой „опыт".

Хулиганы были уверены, что слепые не различат, какой это им преподнесли букет. Однако, они забыли, что слепые, как и все люди, обладают чувством обоняния... Безобразная выходка „авторитетных" комсомольцев была замечена и оскорбленные в своих лучших чувствах хористы, неуклюже толкаясь, сошли с подмостков.

В заключение небольшая протокольная выписка:

«Червенский райком ЛКСМБ, разобрав поступок секретаря ячейки ЛКСМБ З. Марона и члена той же ячейки М. Малевича постановляет вынести обоим выговор с занесением в в личное дело».

И еще:

«Минокружком Комсомола, ознакомившись с дополнительными материалами по делу З. Марона и М. Малевича, учитывая заявление поданное всем хором слепых, постановляет утвердить постановление Червенского райкома ЛКСМБ о вынесении выговоров. Кроме того, Окружком отменяет постановление старого состава Червенского райкома о рекомендации Марона в КП(б) и снимает его с активной комсомольской работы на 6 месяцев».

Безусловно, Марон и Малевич были достойны такого, даже и более строго наказания.

Безмозглые хулиганы, порой прикрывающиеся комсомольским билетом должны быть заклеймены суровым общественным презрением.

Мих. Гольдберг.

Да новых дасягненьняў.

Закончылася 3-я усесаюзная нарада рабселькораў. Рабселькораўская армія у сучасны момант налічвае 250.000 ч., з іх 10.000 юнкораў.

Гэта колькасны рост меў целы шэраг хвароб недалікаў і ухілаў і не адпаведаў якаснаму росту рабселькора і юнкора.

Трэцяя Усесаюзная нарада адзначыла, што юнкораўскі рух колькасна узрослы павінен і у будучыне таксама з посьпехам разьвівацца.

Нарада адкінула усякія прапановы аб зьнішчэньні самастойнага юнкораўскага руху, самастойных юнкораўскіх гурткоў, асобных насьценных газэт моладзі.

Апрача гэтага, вялікі размах руху у значнай ступені тлумачыцца таксама і тым, што мы паступова праводзілі прынцып дабраахвотнасьці. За гэты час жыцьцё паказала нам, што гэты прынцып дабраахвотнасьці трэба паступова праводзіць і надалей.

Нарада па гэтаму сказала, што неабходна даць большую самастойнасьць юнкораўскаму гуртку, даўшы яму права выбіраць рэдакцыйную колегію насьценнай газэты і зрабіўшы самую насьценную газэту органам усяе рабочае моладзі, а ня толькі ячэйкі саюза.

Ня менш важным пытаньнем зьяўлялася таксама пытаньне аб вучобе юнкора. Нарада адкінула усякія спробы і усякія прапановы аб зьнішчэньні юнкораўскіх гурткоў, замены іх нарадамі і адкінула таксама прапанову аб непатрэбнасьці кіраўніка гуртком. Гурток, як асноўная форма вучобы юнкора, павінен застацца.

Кіраўнікі гуртка павінны уважліва надбірацца з ліку актыўных, асьвечаных сяброў саюзу і партыі.

Але-ж, гэта не азначае таго, што гурток павінен працаваць па якой-сьці цьвёрдай, раней распрацаванай праграме. Гэта безумоўна аказеніла-б працу гуртка.

Разам з гэтым, нарада паставіла перад юнкорамі задачу: сур'ёзна узяцца над сваім разьвіцьцём.

Вось асноўныя пытаньні, вырашаныя III усесаюзнаю нарадаю.

Гэтыя пастановы паказваюць правідловыя шляхі разьвіцьця юнкораўскага руху.

Н. С.

Новы прынцып камплектаваньня школ.

Адной з самых галоўных прычын няўвязкі працы школ і піонэрскіх атрадоў зьяўляецца такое становішча, калі у адной школе знаходзяцца піонэры з вялікага ліку атрадаў (іншы раз даходзіць да ста) і у адным атрадзе з шматлікіх школ.

Пры такім палажэньні згоджваньне пляноў і працы амаль немагчымы. Гэта у сваю чаргу таксама стварае перагрузку піонэраў і адарванасьць дзіцячага руху ад школы.

Апрача гэтага разнародны склад вучняў вельмі затрудняе школе у яе грамадзкай працы і сувязі з грамадзкімі організацыямі.

Вось чаму 7-й сьезд УсеЛКСМ прыняў рашэньні з неабходнасьці устанаўленьня для гарадзкіх школ адзінага вытворча—тэрытарыяльнага прынцыпу камплектаваньня школ.

Гэта дасьць магчымасьць зьменьшыць шмататраднасьць у школах. зжыць развой у працы і зьменьшыць нагрузку.

А дзеля таго каб давесьці да мінімуму шмататраднасьць у школе, неабходна будзе таксама правесьці некаторую перагрупіроўку і у піонэр-атрадах, не парушаючы аднак вытворчага прынцыпу камплектаваньня піонэр організацыі.

У вялікіх гарадох праведзеньне гэтага прынцыпу спаткнецца на шэраг перашкод. Галоўныя з перашкод зьяўляюцца раскіданасьць месца жыцьця рабочых і служачых.

Бадай будзе таксама шмат выпадкаў, калі вучням за далечынёй месца свайго жыцьця нельга будзе хадзіць у школу сваёй вытворчасьці дзеля чаго прыдзецца рабіць шмат выключэньняў.

Гэты прынцып у сучасны момант ужо прыняты Наркамасьветы і з пачатку 1926—27 г. яго намечаецца увесьці для усіх гарадзкіх школ.

У асноўным вытворча - тэрытарыяльны прынцып выяўляецца у тым, каб укамплектаваць школу магчыма больш аднародным па социяльнаму становішчу складам вучняў.

Увесь горад згодна гэтаму прынцыпу разьбіваецца на раёны і ідзе устанаўленьне які раён гораду, які прадпрыемствы і установы павінна абслугоўваць школа.

У невялікіх гарадох камплектаваньне неабходна будзе праводзіць па прафсаюзнаму прызнаку.

Дзеці не сяброў прафсаюзу прымаюцца у школу на тэрытарыяльнаму прызнаку.

Да пачатку вучэбнага году неабходна будзе ня толькі устанавіць прынцып камплектаваньня але і правесьці некаторую перагрупіроўку па школам.

Зразумела, што перагрупіроўка павінна быць праведзена, галоўным чынам, у малодшых групах, пад знакам вытворчага прынцыпу і толькі са згодай, як самых вучняў, так і іх бацькоў.

У школах якія займаюцца на нацыянальных мовах неабходна будзе у першую чаргу захаваць нацыянальны склад школы і перагрупіроўку рабіць у тых выпадках калі у горадзе маюцца некалькі нацыянальных школ.

Праведзеньне гэтае працы патрабуе вялікай падрыхтоўкі, у якой актыўны удзел павінны прыняць піонэрскія і комсамольскія організацыі.

Неабходна правесьці вялікую кампанію па растлумачэньню сярод бацькоў шляхам пастаноўкі гэтага пытаньня на сходах прафсаюзаў сярод самага вучнеўства і у піонэрскай і комсамольскай організацыях.

В. Башкевіч.

Решительная борьба—пьянству и хулиганству!

Развертывая массовую работу, организуя досуг молодежи, проводя широкую раз'яснительную кампанию о вреде алкоголя—мы победим это зло.

Як змагацца з гэтым злом.

(Пухавіцкі раён).

На 8-м зьезьдзе комсамола Беларусі т. Крыніцкі ў сваім прывітаньні сказаў, што адна з асноўных задач нашай організацыі—гэта падняцьце дысцыпліны; апроч гэтага, пастановаю зьезду было падкрэсьлена аб умацаваньні выхаваўчай працы па зьнішчэньню неэтычных момантаў у організацыі.

Праводзячы пастановы зьезду ў жыцьцё, мы спатыкаемся на паасобных характэрных момантах, на якія павінна быць зьвернута ўвага ўсяе комсамольскае организацыі.

З матэрыялу Пухавіцкага раёну 104 комсамольцы атрымалі комсамольскія ўзыскі, 20 чалавек выбыла і звольнена з організацыі.

Завошта 104 комсамольцы атрымалі комсамольскія ўзыскі?

За нявыкананьня абавязкаў—41 асобы, за неааведваньні сходу—37, за неэтычныя ўчынкі—15 чалавек.

Можна думаць, што калі так і на далей будзе цягнуцца, дык праз год, як гаворыцца, „ня будзе комсамольца бяз комсамольскага вымавару“.

Шмат якія комсамольцы перастаюць адчуваць адказнасьць за вынясеньне ім наказаньня, кажучы „што ўсё роўна застаецца ў протаколе і прышываецца да справы“.

Частка актыву таксама, не адчувае адказнасьці пры вынясеньні ім выгавору, кажучы: „справы на паасобнага комсамольца няма, а калі няма, дык і сьледу выгавару не застанецца“.

Пры гэтым бюро ячэйкі шаблонна падыходзяць да вынясеньня выгавараў, ёсьць нават выпадкі, калі выносяць наказаньне цэлым групам.

За 5 месяцаў у Пухавіцкай організацыі за пьянства і неэтычныя ўчынкі было вынесена 46 выгавараў. Апрача гэтага, паасобныя факты кажуць аб тым, што п'янства мае яшчэ глыбокія карэньні.

У Блужскай ячэйцы комсамолец—Лінік меў свой апарат і гнаў самагонку. У п'янства ўцягнены ня тольні радавыя комсамольцы, але і паасобныя актывістыя. На другі вялікдзень у аднэй ячэйцы політпрасьвет выпіў, а ў другім месцы сакратар ячэйкі напіўшыся казаў:

— Гаспадар прымусіў, а я адмовіцца ня мог(?!).

У Зацытава-Слабодзкай ячэйцы комсамолец Бразгоўка (зволены) другога году нараджэньня перададзены ў партыю, кажучы, што яму прышоў час ажаніцца, паехаў шукаць жонку. Прыехаўшы ў сельсавет і не знашоўшы сабе там жонкі (дзяўчата не згаджаліся за яго выходзіць, дзеля таго, што ён комсамолец), ён паехаў у Асіпавіцкі раён і знашоў для сябе патрэбную дзяўчыну з умоваю вянчацца. Ен лічыў, што пастаяць пяць хвілін пад вянцом, ня важна, ніхто ня ведае, што ён комсамолец і перададзены ў партыю.

Трэба ўзнаць грамадзкую думку комсамольскай організацыі, вакол такіх фактаў, растлумачыць ім значэньне комсамольскіх узыскаў (устаў)

Бюро ячэйкі павінна больш асьцярожнай даваць выгавары прымяняючы раней выхаваўчыя мэтоды працы.

Унесьці ў програму групы па самаасьвеце прапрацоўку пытаньняў этыкі комсамольцаў, значэньне выпуску рускае горкае (матар'ял можна знайці, дзе маецца архіў „Чырвонае Зьмены).

Неабходна паасобныя-характэрныя неэтычныя факты апавяшчаць на групавых сходах або пры наведваньні сяброў райкому комсамольскіх ячэек.

Звальненьне або дача вымовы за неэтычныя ўчынкі павінны рабіцца на адчыненых сходах ячэйкі ў прысутнічаньні сялянства.

Трэба прыстасаваць масавую працу так, каб адцягнуць моладзь ад розных ня этычных учынкаў. Праводзячы політсуды, вячоркі, культдні, адводзячы ў насьценгазэтах аддзелы быту, высьвятляючы пытаньні комсамольскай этыкі і выпячваючы паасобныя неэтычныя ўчынкі ячэйкі.

М. Табайнік

Хулиганят.

(Минск).

Полноправными „хозяевами“ чувствует себя молодежь в клубе им. Ленина Зап. ж. дор. Знает молодежь, что только в клубе западников можно безнаказанно крыть матом направо и налево; можно, напившись досыта, до отвала, здесь же с'ездить в „Ригу“; можно бить по физиономии кого угодно и сколько угодно; можно устраивать нестерпимую толкотню и давить друг друга перед началом кино сеанса в фойе клуба и т.д.

И так каждый день какой-нибудь скандал, какое нибудь безобразие.

Меры воздействия не принимаются. А следовало бы ячейкам этому уделить внимание— молодежь своим возмутительным поведением в клубе роняет авторитет ячеек. Правлению клуба советую также проснуться.

Колька Каледа.



Хулиганам не место в производстве!

В последнее время в комсомольской ячейке фабрики „Красная Березина“ (Ново-Борисов) стали наблюдаться случаи воровства, хулиганства, пьянства.

Недавно был такой случай: комсомолец из фанерного отделения хотел было стащить несколько спинок от стульев, но этот „номер“ ему не удался.

Этот комсомолец имел за собой еще некоторые хулиганские привычки.

Ячейка комсомола постановила его исключить из рядов союза и производства. Бюро коллектива постановление утвердило. Хулиганам не место в производстве и комсомоле!

В. Н—в.



„Пей, да ума не пропивай“,—

так сказал секретарь ячейки.

У нас, в Горках, комсомольцы уделяют слишком большое внимание пиву. При обсуждении вопроса об устройстве комсомольского или профсоюзного вечера,—задают вопрос:

— А будет ли пиво?

Секретарь комсомольской ячейки союза пищевиков, на общественном суде над комсомольцем, явившемся в пьяном виде,—выступая в качестве обвинителя, сказал:

— Пей, да ума не пропивай!

Этим самым он в глазах комсомольцев и беспартийной молодежи узаконил выпивку пива.

Среди комсомольцев - активистов не редко услышишь: „Выпить можно, но чтобы рядовые не видели“.

Некоторые, привыкнув к мысли, что можно пить пиво, пытаются продвинуться дальше и говорят, что не грех выпить и рюмочку горькой.

Грань между тем, что можно и чего нельзя комсомольцам делать,—постепенно стирается: вчера выпил бутылку пива, сегодня—две, а завтра начинают пить 40—градусную.

Об'явим решительную борьбу пьянству. Пьянство кроме всего прочего, отвлекает комсомольцев от общественной работы, расшатывает здоровье, деньги, время!

Г. Т—хов.

Працуем сярод зьмены.

Вынікі курсаў піонэр-працаўнікоў.

Скончылі сваю працу Усебеларускія курсы піонэрпрацаўнікоў.

Пастаўленая задача—падрыхтоўкі актыву—была выканана, да чаго і была прыстасована складзеная програма, якую ўдалося прапрацаваць на 95 проц.

Выходзячы із неабходнасьці даць нашаму піонэрпрацаўніку веды ў галіне мэдыцыны, фізкультуры і пэдагогікі, гэтым пытаньням вызначылася шмат часу. З выключэньнем пытаньняў пэдагогікі, астатнія былі праведзены добра і далі некаторы аб'ём ведаў.

Цыкл піонэрскі (тэорыя і практыка), які заняў палову ўсяго часу на курсах быў разьлічан на большую самадзейнасьць курсантаў, як практычных працаўнікоў маючых ўжо некаторы вопыт у працы.

Гэта ў кароткіх рысах дасягненьні—да недахопаў трэба далучыць тое, што маючаяся літаратура ў нашай колькасьці ня была досыць добра скарыстана курсантамі.

Перашкаджала працы курсантаў і рознастойнасьць асьвет—програму трэба было орыентыраваць на асноўную масу курсантаў, якая ў колькасьці 36 чалавек (усяго скончыла 52) мае ніжэйшую асьвету—такое становішча выклікала некаторых нездавальненьні з боку таварышоў маючых сярэднюю асьвету, якім распрацоўка матар'ялаў давалася больш лёгка.

Якасны склад актыву палепшыўся—аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы:

З 52 чалавек соц'яльны склад: рабочых—19, сялян—31, служачых—2; па нац. складу курсаў раскладаюцца: беларусаў—37, яўрэяў—14, палякаў—1.

Дасягненьні ў галіне павялічэньня партскладу невялікія—кандыдатаў партыі ўсяго 26 чалавек, па саюзнаму стажу ў большасьці маладыя (23-24 году ў саюзе).

Пару слоў аб далейшых задачах.

Трэба на падставе вопыту мінулага году мясцовым організацыям замацаваць курсантаў для працы на больш доўгі тэрмін, выжываючы бягучасьць актыву.

Грош будзе цана курсам калі курсанты пасьля курсаў ня будуць працаваць над сабой, павышэньне ведаў павінна стаць абавязкам кожнага курсанта, кожнага піонэрпрацаўніка.

Атрыманыя веды павінны быць перададзены ўсяму піонэрактыву раёну, дзе курсантам прыдзецца працаваць, гэта таксама павінна спрыяць павялічэньню кіраўніцтва з боку ячэек комсамолу атрадамі.

З большымі ведамі да працы!

Задач шмат, добрай падрыхтоўкай і якасным палепшаньнем актыву мы зможам іх выканаць.

Міхась Лабэдаеў.

Ці патрэбны камісіі

па піонэр-працы пры комсамольскіх ячэйках?

Працягваем абгаварываньне пытаньня.

У ячэйках, дзе маецца 2 атрады—камісіі патрэбны.

Вопыт працы паказаў, што там, дзе ячэйка зацікаўлена ў працы піонэрскага атраду—праца пастаўлена добра, а дзе ячэйка дрэнна кіруе,—там слаба і праца атрада.

Маюцца, напр. ячэйкі, якія лічаць, што кіраўніцтва ў цэлым працаю атрада належыць райпіонэр-бюро. Прыходзяць і заяўляюць:

— Прыдзеце ў атрад, а то праца разваливаецца.

Замест таго, каб даць кіраўніцтва ячэйцы, райбюро па іх думцы павінна сядзець у атрадзе і „не даваць развальвацца“.

Сакратар аднае саўхозкае ячэйкі, падрыхтоўваючы піонэраў да ўрачыстага абацаньня, заявіў.

— Куплю гальштукі піонэрам саўхозу, а вясковым (вясковы атрад прымацаваны да саўхозкай ячэйкі) купіць райдзетбюро.

Недахопаў у кіраўніцтве комсамольскіх ячэек піонэратрадамі—шмат. Гэта ўсё сьведчыць аб тым, што ячэйка не цікавіцца аднаю працаю, што кіраўніцтва трэба ўмацаваць.

Я згодна з тав. Столярам, што організацыя камісій па працы сярод піонэраў у ячэйках—неабходна.

Але патрэбна організаваць іх у тых ячэйках, якія маюць ня менш 2-х атрадаў (там дзе пры ячэйках 1 атрад камісія будзе ўносіць толькі блытаніну ў працы).

Апрача організацыі камісіі пры ячэйках, трэба ўмацаваць кіраўніцтва і райкомаў, а то ячэйкі ня ведаюць, як практычна кіраваць атрадамі.

Іоха.

Камісіі не патрэбны.

З слоў т.т. Столяра і С. Жалязьнека відаць, што быццам-бы камісіі і саветы атрадаў ня маюць ніякай розьніцы. Дык навошта-ж тады рабіць розьніцу паміж камісіяю і саветам атраду?

Мне думаецца, што не патрэбна ствараць гэтых комісій, а лепш за ўсё ўмацаваць працу Саветаў атраду, а то яны надта ўжо дрэнна працуюць.

Стварэньне гэтых камісій зьяўляецца таксама ні чым іншым, як распыленьнем нашых сіл. Апрача гэтага патрэбна паставіць на належную вышыню працу ўжо існуючых камісій пры ячэйках, а не ствараць новыя.

Камісіі пры ячэйках па працы сярод піонэраў ёсьць нішто іншае, як праціва пастаўленьне савету атрадаў і сэмінарыям, якія у нас маюцца ў шмат якіх раёнах.

К. Бразгуноў.

Пытаньне пастаўлена своечасова.

Пры многіх ячэйках маецца некалькі атрадаў. Апошнія патрабаюць агульнага кіраўніцтва і ўвязкі працы. Вядома, што найчасьцей бюро ячэек бываюць перагружаны іншымі пытаньнямі і ня маюць магчымасьці зьвяртаць належнай увагі піонэрпрацы. Пытаньне, аб стварэньні камісій, яшчэ пакуль што ня вырашана, а ўжо пры шмат якіх ячэйках працуюць так званыя нарады павадыроў атрадаў, альбо саветы баз, якія па сутнасьці сваёй, зьяўляюцца камісіямі. Зьбіраюцца, рэгулярна разглядаюць пытаньні, якія тычацца ўсіх атрадаў пры данай ячэйцы, адчытваюцца перад бюро ячэйкі і г. д.

І. З.

Каго выбіраць у камісію

Прачытаўшы заметку тав. Столяра і заметку як апісвае вопыт працы піонэрскай камісіі ў ячэйцы—я паставіў перад сабой пытаньне:

— Каго-ж выбіраць у камісію пры вясковай ячэйцы, калі ў камісіі павінны быць: павадыр атраду, настаўнік, прадстаўнік ад ячэйкі ВКП, ад бацькоў, доктар, жэн'організатар і г. д. У вёсцы гэта зрабіць не магчыма. Я стаўлю пытаньне на абгаворваньне.

Малаткоў Паўлюк.



Про Сашкин авторитет.

Сашку знаете. Неужели не встречали его? Бритый такой, в пенсне и все по деревням раз'езжает—в шефкомиссии работает при ячейке связи. Не знаете?.. Ну, да ладно...

Сладкие слова, что-ли у Сашки или еще что—только, как Сашка в деревню дунет, так оттуда жди всегда его с „прибавкой“. Обязательно с каким-нибудь деревенским парнем вернется.

Вина ли самого Сашки или вина постороннего свойства, а факт фактом остается...

Ездил зимой частенько в деревню шефкомиссник, а к весне отрыгнулось..

Сначала письма посыпались...

„Товарищ Саша, положение мое не завидное... и я думаю, что устроюсь в Могилеве. Жди, скоро приеду.,.“.

За письмами появились и авторы их... Первая ласточка—Ваня из деревни Недоедаловки. Зипун—все его пожитки... Положение — отставной секретарь ячейки, а виды на дальнейшее—надежда на Сашу...

Приехал, обосновался в комнате у Сашки и живет—все надеется поступить...

За секретарем ячейки из Недоедаловки и остальные комсомольцы потекли, и все к Сашке. Кто письмом предупредит, а кто так—сюрпризом вроде...

А я знаете кто? Я с Сашкой живу, так мне все это доподлинно известно. И не раз я пробовал разузнать и чего это ребята из деревни утекают... Работы там, должно быть, к весне вволю, а тут такая утечка комсомольского элемента...

К Ване из Недоедаловки обращался—так тот только воззрит на меня и ни слова, а то проронит:

— Житье нудное... Чать здесь устроюсь..

Перехватывает Ваня работишку самую немудрящую—площадку там вскопать, подместь-ли, и плата мизерная...

— Чего-же ты, Ваня, в деревне-то такой разве работы не нашлось?..

Ну, Ваня то ладно—устроился он кучером на почте на третий месяц своего пребывания в городе... Вот другие ребята, что приезжают так в полную неприглядность попадают... Ходят по дачам, работы ищут... А в деревне говорят самая жаркая пора наступила—рабочих рук не хватает...

Далеко бежит Сашкина слава. Недавно получил Сашка письмо из деревни, да откуда? Из деревни уезда такого, где и не был ни разу... А письмо просящее:

„Устрой, как нибудь...“

Эх, ребята, ребята, жалко мне становится глядеть на друга своего Сашку...

Измотался он весь... И кто это про него слух такой пустил, что устраивает он в городе ребят на работу. Так разрешите вас разуверить... Вот все это про Сашку. И ни каким тут у нас в Белоруссии особым весом не пользуется—и ни куда не может устроить он вас. Бросьте вы ему понапрасну письма писать...

Оставайтесь в деревне,—работайте. Работа везде одинакова, только в городе трудней ее найти.. А найдешь—так ночевка не обеспеченная—хоть под мостом ночуй... Потому у Сашки и комната-то мусорная всего на 2 человека.. Больше не втиснешь.

А что Ваня из Недоедальки в ямщики поступил, то это он не через Сашку .. Да и поступил-то Ваня через три месяца. А на что спрашивается жил он до службы... Не жил—прямо мучился.

Оставайтесь ребята в деревне и работайте. Я вам по секрету скажу:—сам то Сашка хочет в деревню утекать, потому, говорит в деревне работа лучше, нагрузки нет, да отдохну немного.

И кто это слух по Сашку пустил. Хотел он сам опровергнуть его, да некогда: сейчас пятьдесят первое письмо перечитывает, а отвечаю я, его первый друг и сожитель.

Вадим Голодный.

Клюбнае.

(Частушкі).

Піонэры у клюб ідзіце
І старыя й тыя йдуць.
Сёньня ў громка-гаварыцель
Нам па радзіо пяюць.
Вось цяпер я ня нуджуся,
І праводжу вячарок.
Кожны раз ня прапушчу я
Наш спортсмэнаўскі гурток.

У мяне брат перамена,
Напішу ў газэту ліст.
Я цяпер на нашай сцэне,
Выступаю, як артыст
Ў клюбе я для сьцен-газэты
Стаў пісаць ня так даўно
Можа буду і поэтам,
А цяпер пакуль дзеткор.

Алесь.

На вясковай гаспадарцы.

Ні самім паглядзець, ні людзям паказаць.

(Вёска Санюкі, ШСМ. Мазыршчына).

Школа пераехала ў Санюкі ў красавіку 1925 году. Зразу сяляне глядзелі на школу прыемна: з пачат ку агрономам (ён жа і загадчык школе) былі організаваны двохтыднёвыя курсы для сялянства, якія вельмі ахвотна пасяшчаліся сялянамі. На курсах гаварылі пра шматпольле, як сеяць бульбу, пра вырошчваньне кораньплодаў і г. д. Аўторытэт школы падымаўся ў вачох сялянства. Пабачым, што было далей. Прыступіла школа да апрацоўкі свае зямлі. Што-ж убачылі сяляне? На курсах агроном казаў аб карысьці шматпольля, а ў школе няма і трох польля, казалі як трэба вырашчваць і захоўваць бульбу, а школа як захавала, дык 200 пудоў згніло. Гэта было ў леташнім годзе. Пабачым што ў гэтым. Пасеялі расаду капустную—прапала, бо ні разу не палівалі. Пасеялі гарод пазьней усіх сялян, узышоў ён праз тры нядзелі, ва адным каліву, бо таксама не палівалі. Замест таго, каб даць расады сялянам, школа сама купляе. Сад не апырскан, лісьцё леташняе з дрэў не пазьбірана, па садзе, як гаспадары ходзяць сьвіньні.

Кажуць цяпер сяляне—якая карысьць нам ад школы?

„Казалі вельмі многа, а самі бульбы і той захаваць ня могуць, пагнаілі“. „Казалі шмат, а зрабілі, дык ні самім паглядзець, ні людзям паказаць“. Трэба каму належыць зьвярнуць на гэта ўвагу. Патрэбен другі агроном. Бо так школа далей існаваць ня можа. Школа не апраўдвае сябе ў вачох сялянства.

Не агроном.

За рэволюцыю на полі.

(В. Забалацьце, Пярэжырскага сельсавету, Сьмілаўскага р.).

Да сёлятнага году нашы комсамольцы ўсё спадзяваліся на агронома, што той прыедзе. Але пабачыўшы, што агроном прыяжджае ў вёску адзін раз на усім годзе, яны пакінулі спадзявацца на агронома, а узяліся самі за працу. Пад вясну яны пачалі агітаваць сярод сялян за пасеў на папары лубіну і канюшыны.

Цяпер ужо адна зьмена засеяна канюшынаю, другая—лубінам, і толькі адна—засталася пад папарам.

Таксама пад агітацыяй комсамольцаў амаль ня ўсе сяляне сяголета пасаджвалі турнэпсу, буракоў і розных кармовых траў.

Пагонскі.

Падрываюць гаспадарку комуны.

(Ячэйка ЛКСМБ „Промень Соцыялізму“, Самахвалаўскі раён).

Гэта ячэйка складаецца з вясковых комсамольцаў (11 чалавек) і 9-ці комсамольцаў з комуны „Промень Соцыялізму“. Комсамольцы ў комуне стараюцца падняць сваю гаспадарку, а вясковыя комсамольцы (вёска Нова-Двор) стараюцца ўсякім чынам задарваць комунальную гаспадарку. Вядуць агітацыю сярод сялянства, што комуна ўладае вялікім кавалкам зямлі, што комуне адышоў панскі лес і разам з сялянамі вядуць на палі камуны скаціну, травяць сенажаць і псуюць лес, кажучы —што цяпер свобода—як комунальнае, так і наша. Нова-Дворскія комсамольцы такім чынам знаходзяцца наперадзе дробна - уласьніцкіх настрояў і тэндэнцый сялянства. Ці павінны ў нас быць такія комсамольцы і куды глядзіць ячэйка.

Блізкі.

Атрымалі прэмію.

У нашай вёсцы Забалоцьце, Лепельскага сельсавету два гады таму назад, пасьля двухтыднёвых сельскагаспадарчых курсаў па ініцыятыве комсамольцаў быў з'організаваны сельска гаспадарчы гурток. У яго сябрамі ўваходзіць больш 30-ці сялян, ёсьць праўленьне ў якое ўваходзіць наш вясковы комсамолец.

Сяляне дужа цікавяцца працай гуртка і дапамагаюць грашыма, на якія выпісваюць патрэбныя газэты і часопісі.

Першы-ж год пасьля зімы летам адразу перашлі на практычную працу і вынікі ў гэтым ёсьць вялікія: у 1925 годзе, на раённай выстаўцы сябры нашага гуртка атрымалі прэмію —арфу за добрую агародніну, садоўніцтва і другія экспонаты ў сельскай гаспадарцы.

У гэтым годзе гуртком прывезьлі ў вёску зернячыстку і ўсе сяляне ачысьцілі і пасеялі чыстым збожжам.

Трымаем моцную сувязь з раённым агрономам, які дапамагае нам парадамі і літаратурай.

Карабан.

На правільны шлях.

(Некалькі ўваг да працы с.-г. гуртка).

У першую чаргу неабходна застанавіцца на пытаньні кіраўніцтва. Да гэтуль яшчэ тут наглядаецца ненармальнасьць. Рашэньне аб тым, што кіраўніцтва гурткамі пераходзіць ад комсамолу да політасьветы было, разумеецца, правільным, але ў справе правядзеньня яго ў жыцьцё нагляваецца зацяжка. Органы політасьветы яшчэ ня ўпрэгліся ў кіраўніцтва а організацыі комсамолу ўжо адыходзяць ад яго. У выніках гэта вядзе к пагоршаньню працы гурткоў.

Месцамі пакуль што ёсьць бараць-ба за кіраўніцтва гурткамі і організацыі комсамолу ня хочуць перадаваць яго політасьветам.

Ліню на тое, каб гурток кіраваўся політасьветам пры актыўным ўдзеле комсамолу і другіх грамадзкіх організацый трэба, праводзіць вельмі рашуча.

Бліжэй да практыкі.

Большасьць сельска-гаспадарчых гурткоў займаецца пакуль толькі тэорэтычнымі пытаньнямі і праводзіць лекцыі і гутаркі, не ўвязваючы іх з вопытам і паказам.

Аднак, ёсьць шмат і такіх гуртоў, якія праводзяць грамадзка палітычную працу з посьпехам праводзячы зернаачышчэньне, пераход на шматпольле, карыстаньне машынамі і г. д.

На верную дарогу.

Сельска-гаспадарчаму гуртку павінна належаць ініцыятыва, ён павінен падбухторваць сялянства к таким мерапрыемствам, як электрофікацыя, утвареньне машыннага таварыства, але правядзеньне іх павінна ісьці цераз адпаведныя організацыі.

Аб узростах.

З вялікім прыцягненьнем дарослага сялянства ў склад гурткоў, паменьшыўся у іх удзел моладзі. Есьць думка, што моладзі цяжка працаваць з старэйшымі, што патрэбен падзел. Падзяляць гурткоў ня варта: трэба у працы адзінага гуртка сумець здаволіць запатрабаньні дарослай і маладой часткі сялянства.

Гэтага можна дабіцца ці шляхам вылучэньня сэкцыі, ці адпавядаючай пабудовай програм. Пытаньне аб кіраўніках: тут трэба паставіць працу на большую долю самадзейнасьці і самаадукацыі.

П. Н.

Экономия на производстве и в работу!

Где питаться—дома или в столовке?

(Весь материал помещается в порядке обсуждения).

Тов. Нотка перед всей рабочей молодежью поставил вопрос: где питаться? Вопрос довольно серьезный и его не так уж легко разрешить, как это сделал тов. Нотка.

Тов. Нотка призывает молодежь к питанию дома, у родителей, об'ясняя тем, что это будет экономнее, чем питание в столовке. При этом тов. Нотка подстриг всю молодежь под одну гребенку, забыв, что у нас не все ребята живут с родителями.

Безусловно, наша рабочая молодежь не умеет правильно расходовать свой заработок. Мы все знаем, что часто ребята, хорошо зарабатывающие, живут впроголодь. Но следует ли из этого делать вывод, что столовки не нужны и от питания в них надо отказаться?

Нет, тов. Нотка. Согласиться с тобой—значит одним росчерком пера уничтожить все решения партии и союза по вопросу о втягивании молодежи в кооперацию, по вопросу о внедрении в быт молодежи навыков к коллективизму, в данном случае к общественному питанию.

Не так нужно ставить вопрос.

Дело в том, что никто не помогает молодежи научиться правильно расходовать свой заработок. И регулятором и организатором бюджета рабочей молодежи может и должна стать кооперация.

Как мы питаемся в столовках? Придем этак пообедать, закажем обед, а к обеду еще то и другое,—смотришь настукало на один рубль, а то и больше. Этого можно избежать если администрация столовых ЦРК будет брать помесячно сразу все деньги за обеды. Тогда каждый был-бы обеспечен пищей на целый месяц.

Мне скажут, что это означает перестать быть хозяином своих же денег. Нет. Такой метод расходования заработка уже оправдал себя. В частных столовых это так и практикуется

Я здесь выпятил один момент в деле организации правильного общественного питания рабочей молодежи.

В дальнейшем ходе обсуждения затронутого вопроса работники кооперации и наших эконом. отделов выдвинут новые предложения по этому поводу.

Аницук.

„Не допускать семейные неурядицы“!

Столоваться дома—дело хорошее. Но вместе с тем, надо сказать, что здесь возможны и крупные противоречия между комсомольцем и остальными членами семьи.

Я знаю одного комсомольца-кожевника который заключил „договор“ с родителями, чтобы питаться дома, за что отдавать свое небольшое жалованье в общий котел. Но через небольшой период времени комсомолец этот остался недоволен питанием дома, стал протестовать, грубить, ломать горшки и тарелки и т. д. А дальше пошло еще хуже: уличные бои между сыном и отцом-рабочим, матерные ругательства, скандалы и т. д. Дело кончилось судом.

Вот что значит иногда столоваться дома.

Почему комсомолец остался недоволен обедами дома? Потому, что он требовал сытного, горячего обеда, а не холодных остатков, которые он получал возвращаясь с собрания или заседания.

Мое мнение, что столоваться нужно дома только тогда, когда знаешь, что не будет семейных неурядиц. В противном случае—бесполезно.

Война прогулам!

(Шклов, фабрика „Спартак“).

10 проц. рабочих нашей фабрики делают ежемесячно прогулы. Месяц май отличился в этом отношении и процент прогульщиков увеличился с 10 до 15.

На это явление обратило внимание заводоуправление, фабком и семерка по борьбе за режим экономии. Было выпущено специальное воззвание к рабочим о борьбе с прогулами

По официальным сведениям табельного отдела **комсомольцами сделано в мае месяце 26 прогулов по не уважительным причинам и десять по уважительным.** Это число прогулов так распределяется по цеховым ячейкам: яч. машинного отд.—11 прогулов, яч. аппаратурной —5 прогулов, паккамеры—6 прогулов.

Большинство сделанных прогулов об'ясняется тем, что ребята перешли на „летние формы работы“. Ребята гуляют с девчатами в парке до 4-х часов утра, в то время, как в шесть часов надо быть уже на работе у станка. Понятно, что вследствие этого ребята или сильно опаздывают на работу или придя на работу, клюют там носом...

Рекордное место прогулов в мае месяце заняли комсомольцы: **Гольдман Ж.** (3 прог.), **Кусикова А.** (2 прог.) и **Смирнова** (2 прог.).

Дезертиры трудового фронта должны получить соответствующие наказания от комсомольской ячейки!

Г. Спартаковский.

Крапіва.

На пасёлкі.

Нібы ў патрывожаным чмяліным гнязьдзе стаяў гул у хаце Антося Драча. За сінімі воблакамі дыму цяжка было разгледзець рысы твараў. Шапкі і касматыя каўняры кажухоў ды дзе-ні-дзе яшчэ чорная або рыжая шчотка барады—вось і ўсе, што зразу можна было разгледзець.

— Антось. Гэта-ж твая лямпа тухне. Ці ёсьць у ёй газа?

— Газы я толькі што наліў; гэта духу сабралася, дык яна і тухне. Падлажы там на шклошчэпку, а я прычыню трохі дзьверы.

— А вы, жвўжыкі, чаго тут боўтаецеся, як у палонцы, — не пара спаць?

— Але ліханька ім, і сну на іх няма Скарэй за сталага дапнуць усюды.

— І дзе іх настаўнік, чаму ён іх за вушы ня круціць?

— О, цяпер біцца ня можа. Наш настаўнік добры, ён так нас навучае.

— Навучае... Наўчыў вось цябе на сабак брахаць.

— Глядзі хаця, каб твой Васіль, што „дабро“ мясіў, не брахаў, а я то не брашу.

— А што, вось і займіся з брыдою. Гэта-ж так шарахвост—ён-жа табе з-пад сучкі яйцо ўкрадзе.

— Мусіць гэтак, як ты пасак у Сроліка.

Кругом зарагаталі.

— Ах ты, сукін сын, дык ты будзеш яшчэ аскізацца.

Але пакуль Пятрусь расьперазаў папружку, дык хлапец, як уюн, прашыўся між дарослых і зарагатаў ажля парогу.

У другім кутку чуўся голас Міколы Маркач, якога, кругом акучыўшы, слухала чалавек дзесяць мужчын.

— Едзем мы гэта сабе—яны папераздзе, а я за імі. Пад'яжджаем мы гэта пад рэчку, аж бачым — конь у аглаблёх ляжыць на лёдзе і чалавек каля яго тупае. Браткі, кажа, памажэце. Гэта-ж ліха на яго, падковы тупыя, дык ён ніяк астаяцца ня можа. Я ўжо зьлез, хацеў ісьці—што ж, бяда чалавеку. Ну й чалавек з цябе, —адказалі з пярэдняга возу. Ня ведаеш, што рабіць? Вазьмі распраніся ды падсьцялі кажух, — ён абапрэцца, астоіцца й пойдзе. „А можа й праўда“, прагаварыў той і, доўга не чакаючы, кажух з плеч дый падкінуў яго пад перад каню. Конь, як-бы здагадаўшыся, што трэба рабіць, паставіў, абедзьве пярэднія нагі на кажух ды давай гэта папяцца, каб устаць...

— А можа й памагло?—запытаўся адзін з слухачоў.

— Дзе ты бачыў. Ногі як пакаўзнуліся, дык кажух аж да самага каўняра...

— Мужчыны, дык мы ўжо пачнём? Больш бадай мала хто й прыдзе? — запытаўся старшыня сельсавету.

— Ды ўжо, хто меўся, то прышоў.

— Можна пачынаць, а то пакуль мы зьбяромся. дык людзі й ноч разьбяруць,— адказалі некалькі галасоў.

— Дык, знацца, дазвольце сход лічыць адчыненым. Цяпер нам трэба абраць прэзыдыум для вядзеньня сходу.

— Ды які там яшчэ празыдым Вось ты й кіруй—табе больш вядома.

— Протакол пісаць, вось Кастусь Грыбоў можа, ён добра граматны,—запрапанаваў нехта.

— Кастусь. Кастусь. Вы ўдвох, дый будзе! Чаго там яшчэ, — падхапілі разам некалькі галасоў.

— Супроць ніхто ня мае?

— Ды не. Не!

Якое там „супроць“, гэта-ж не дзяліць што-небудзь выбіраем, або ня ў чаркі гуляць.

— Дык вось слухайце — я вачытаю парадак дня.

Ужо зараз і ноч пройдзе, а ён яшчэ парадак дня зьбіраецца чытаць, —пачуўся асьцярожны голас ад печы.

— Першае пытаньне гэта, знацца, аб выхадзе на пасёлкі,—прагаварыў старшыня.

—Яшчэ якую хваробу выдумаюць. Мала яшчэ гэтага, дык хочуць, каб апошнія порткі скінулі.

— Бач, не падабаецца. Чаму-ж табэ й так раскошна, Кадук цябе не бярэ.

Загулі, загаманілі, закрычалі, а што-нельга было распазнаць.

— Дык ціха-ж. Чаго вас так узнасіла?—крычаў старшыня.—Гэта-ж яшчэ толькі парадак дня.

— Які гэта, чорта матары, парадак. Ніякага парадку няма, — кіпеў Сьцяпан Крываножка.

— Ціха. Слухайце далей.

Гоман патроху сьціх.

— Другое пытаньне аб начной варце, трэцяе—бягучыя справы. Дабаўленьняў ніякіх ня будзе?

Усе маўчалі.

А што гэта да стравы такія бягучыя?—запытаўся стары Мацей.

Некаторыя засьмяяліся.

— Ды ўжо-ж, калі бягучыя, дык няйначай—рэдкія: можа крупнік ці заціркa,—жартавалі другія.

— Справы, а ня стравы. Гэта, знацца, тое, што мы будзем абгаварваць—разумееш?—растлумачыў старшыня.

— Ды ўжо цяпер буду, мусіць, разумець,—адказаў пытаўшы.

— Дык дабаўленьняў, пытаюся, ніякіх ня будзе?

— Ды не. Якія там дабаўленьні.

— Дык пазвольце павестку лічыць прынятаю.

— Дазваляем, — адазваўся зноў адзін голас сярод агульнага маўчаньня.

— Дык вось я хачу, знацца, некалькі слоў па гэтым пытаньні. Зямлі ў нас, як вам вядома, кот наплакаў. Дый зямля ня надта што: дзе пясок, дзе мылец, а дзе й сам не разьбярэш, што яно такое. Ня тое, што вунь у Кармалёх, што, каб дзіця пасадзіў на ральлі, як кажуць, то й яно-б расло. Яшчэ б не такая бяда каб гэта зямля ды ў адным куску, вобрубам, знацца, а то глядзеце вы: гэта-ж толькі аднаго поля шаснаццаць палосак ды сенажаці сем, вось і лічы, колькі ўсяго будзе. Вядома, што пры гэтакай шматпольнай церас палосіцы гаспадарку падняць нельга. А тут яшчэ некаторыя палосы вунь у чортавых зубох. Гэта-ж пакуль ты ў Калюшкі завязёш воз гною, дык у гарод-бы сем-восем вывез—і каню лягчэй, і ў працы спарней. Вось Савецкая ўлада, знацца, і павярнулася гэтым самым тварам да вёскі. А як павярнулася, дык і ўбачыла, што ў нас непарадкі. Дапамагчы-ж гэтым непарадкам можна толькі вышаўшы на пасёлкі. Тым, хто выходзіць на пасёлкі, Савецкая ўлада дае палёгку: прысылае, знацца, каморнікаў агрономаў і шмат яшчэ чаго. Вось нам сёньня таксама трэба пагаварыць пра гэта, каб, значыцца, выпісаць каморніка і ўсякія там штукі і з вясны ўжо пачаць рэзаць.

(Канец будзе ў чарговым нумары).

У МК ЛКСМБ.

○ Ўся Акцябрская раёная організацыя ЛКСМБ, а таксама некаторыя ячэйкі ЛКСМБ гарадзкога раёну, якія сатаварыстваюць з 5-м і 6-м палком, па пастанове бюро акругкому, будуць прымаць актыўны удзел у працы па адчыненьні чырвонаармейскіх лягэрэй.

У МЕНАКРБЮРО Ю. П.

○ Акрбюро ухваліла 4-ю гадавіну Менскай піонэрскай організацыі правесьці 20-га ліпеня. Згодна выпрацаванаму матарыялу, да падрыхтоўкі гадавіны прыцягваюцца старые піонэры, а таксама быўшыя піонэры—цяпер комсамольцы. Гадавіна пад'ітожа ўсе этапы працы Менскай піонэрорганізацыі. У дні сьвята будуць праводзіцца гутаркі, вечара, дэмонстрацыі, маёўкі, выстаўкі і г. д.

Усё сьвята праводзіцца з мэтай папулярызацыі піонэрскага руху сярод дарослага насельніцтва.

○ Акрбюро Ю. П. пачынае абслядаваньне працы піонэрсемінарый пры раёных бюро Ю. П.

Для абслядаваньня вылучана камісія у наступным складзе: т. т. Ільлін, Столяр, Лочкіна, Шыф і Жыжэля.

○ Акрбюро Ю. П. сумесна з таварыствам „Чырвоны Крыж" організуе лягер для хворых піонэраў, тэрмінам на 1 месяц, які разьмеркоўваецца на 30 чалавек. Набор у лягер будзе праводзіцца праз сухотны дыспансер і адчыніцца у ліпні г. г.

СПАСИБО ОТ МОРЯКОВ.

Письмо из Балтийского флота.

От имени моряков и командного состава линейного корабля «Парижская Коммуна» Балтийского флота, приношу благодарность Минской и Витебской организациям ЛКСМБ за посылку своих представителей и материальную помощь линкору в сумме двухсот пятидесяти рублей.

Остальные О. К. должны равняться по Минску и Витебску, взявшимся за практическое шефство, ставя упор в первую очередь на ликвидацию флотской неграмотности среди членов ЛКСМБ.

Организатор ВЛКСМ линкора КУЗНЕЦОВ.

ПРОФСОЮЗНЫЕ НОВОСТИ.

○ Центральное правление профессионального союза связи постановило повысить зарплату работникам связи по Минску, Витебску и Рогачеву.

○ Центральным пожарным отделом при Комхозе постановлено с нового учебного года открыть в Минске курсы по подготовке техников и инструкторов по пожарному делу.

ПРОСВЕЩЕНИЕ.

○ 15 июня в Минске Наркомпросом открываются шестинедельные курсы по переподготовке еврейских учителей.

○ С нового учебного года при минском и витебском евпедтехникумах открываются параллельные отделения первого курса.

О ТОМ И О ДРУГОМ.

○ За последнее время в сельхозмастерских им. «Бурбиса» установлено 8 новых заграничных станков. Прибыл 36-ти сильный нефтяной двигатель.

○ Галоўпрафасьветы БССР пастанавіла надаваць стопень кваліфікацыі для выпускнікоў індустрыяльных тэхнікумаў праводзіць не раней як па праходжаньні 2 летняй вытворчай практыкі.

○ Высшим советом физкультуры разработана и рассылается на мес а по округам программа 2 го Всебелорусского праздника физкультуры.

СКЛАД ПРАЎЛЕНЬНЯ БДУ.

Абраны і зацьверджаны: 1. Прафэс.—Пічэта—рэктарам. 2. Загадчык рабфаку Слонім—намесьнікам рэктара. 3. Праф. Кроль—сябром праўленьня. 4. Дацэнт Друшчыц—сябр. праўл. 5. Студэнт Лапотка—сябрам праўл. па студэнцкім справам.

ДЛЯ СПРАВОК.

Об увольнении рабочих и служащих.

Циркуляром от 6-го мая 1926 года, за № 63-673 ВЦСПС раз'яснил, что обязанность нанимателя предупреждать нанявшегося за две недели вперёд о предстоящем увольнении, с заменой предупреждения выплатою выходного пособия в размере его двухнедельного заработка. Это установлено в целях облегчения нанявшемуся возможности подыскать другую работу в течение срока предупреждения.

В виду участившихся случаев обхода закона, налагающего на нанимателя вышеупомянутую обязанность, путем предоставления очередного отпуска с одновременным предупреждением о предстоящем увольнении, дабы время отпуска зачесть в срок предупреждения, ВЦСПС предлагает решительно бороться с этими незаконными действиями нанимателей.

ФИЗКУЛЬТУРА.

Как надо купаться.

Чтобы купаться с пользой, нужно запомнить несколько основных правил.

Плавать рекомендуется не раньше, чем через полтора часа после принятия пищи. Входить в воду потным можно, но дыхание и пульс при этом должны быть покойны. Вход в воду лучше всего совершать прыжками, головой вниз.

Быть в воде следует только до первого озноба. Как только тело покроется «гусиной кожей», нужно немедленно-же прекратить купанье, выйти из воды и растереть тело до красна полотенцем.

РАДИО ХРОНИКА.

○ На острове Куба насчитывается до 3.000 установок. На детекторные приемники принимается главным образом станция в Гаванне.

○ Церковные круги Рима заняты мыслью о возможности передачи церковной службы из Рима в Голландию. Было подано прошение правительству о разрешении строить специальную станцию для этой цели.

○ В ближайшее время открываются радио-станции в Баку и в Вологде, сконструированные Нижегородской радио-лабораторией им. Ленина. Отправлены передатчики для установки в Тверь и Эривань, а к концу лета будут установлены станции в Бахмаче и на Нижнем Поволжье.

○ Последним изобретением известного американского изобретателя Джовкинса является так наз. «радио-перо». Оно состоит из пера, снабженного особым приспособлением, воздействующим при письме на передающую станцию так, что перо в приемной станции выводит на бумаге точь в точь такие же буквы, как и в передающей.»

ЧТО ЧИТАТЬ.

«Работа по книге и газете». О Тарнопольская. Изд. „Долой Неграмотность", Москва. 1926 г., стр. 123, цена 80 к.

Многие покупают книги, выписывают газеты, но систематической, углубленной работы с ними не ведут. Частенько они путаются в них, не разбираются, не находят нужного.

Работа среди молодежи по части раз'яснений, как читать, не ведется. Все это надо запомнить и использовать предлагаемую книгу.

Ее нужно иметь каждому библиотекарю, избачу, кружководу по самообразованию, а также и всем желающим серьезно заняться самообразованием.

Книжка дает хорошие практические указания, как приступить к чтению книги, газеты, как с ними работать.

Что читать радио-любителю.

«Радио при м и радио-приемники»—инженер С. И. Шапошников, издание Общ. Друзей Радио РСФСР, стр 103, цена 50 коп.

Книга написана простым понятным языком, снабжена рядом чертежей, рисунков и простейших вычислений. В качестве А и Б азбуки радио-техники для неподготовленного читателя служить не может. Здесь сразу вводится, как известное, ток, емкость самоиндукция и т. п.

Но она вполне может дать радио любителю, нахватавшемуся, как в большинстве водится, различных отрывочных сведений некоторую теоретическую подготовку, позволяющую уже с большей сознательностью конструировать и работать с приемником.

Рабинович.

ЗАПЫТАНЬНІ І АДКАЗЫ

Запытаньне № 217. Дзеля чаго вучняў прафшкол мэталістаў не прыймаюць у прафсаюз мэталістаў, між тым, як прафшкольцы іншых прафшкол зьяўляюцца сябрамі прафсаюзу.

Адказ. З наступнага году згодна пастановы ВЦСПС прафшкольцы у прафсаюз не будуць зусім прымацца, незалежна ад таго у якой школе яны знаходзяцца. Выклікана гэта тым, што па статуту у прафсаюзы прыймаюцца толькі рабочыя якія працуюць па найму, а не прафшкольцы—вучні, якія не працуюць па найму.

Запытаньне № 218. Што рабіць прафшкольцу, які у гэтым годзе канчае прафшколу і у прафсаюз не быў залічан як іншые, а на працу прымаюць толькі сяброў прафсаюзу.

Адказ. Сьпісы усіх, якія скончваюць курс навучаньня у прафшколах прадстаўляюцца у Наркам. Працы ці яго акраддзелы, якія залічаюць прафшкольцаў на працу, незалежна ад таго, ці зьяўляюцца яны сябрамі прафсаюзу ці не.

Запытаньне № 219. Якія умовы прыему на рабфак і калі пачнецца прыем заяў?

Адказ. У першых нумарох „Ч. З." за гэты месяц, умовы надрукованы. Прыем заяў пачнецца 1-га ліпеня і скончыцца 1-га жніўня.

Запытаньне № 220. Калі пачнецца прыем у прафтэхшколы, якія трэба мець веды для паступленьня туды, і па якім прадмэтам прыдзецца трымаць залікі?

Адказ. Прыем заяў адбудзецца з 15 га ліпеня па 15 жніўня. Трэба мець веды 5-ці годкі. Залікі прыдзецца трымаць па наступным прадмэтам: грамадзяназнаўства, географія, прыродазнаўства, матэматыка, беларусазнаўства і расейская мова.

В МИНУТЫ ДОСУГА.

Омоним-логогриф № 1.

Где-то у Байкала
Я беру начало,
И меня, бывало,
Так же мать звала;
Если «В» в начале
В город вы попали;
Буквы же смешали,—
Я в залив ушла.

Метаграмма № 4.

С буквой „б"—сижу на бочке
Прямо козырем;
С буквой „в"—я буду точкой
Там, за Мозырем.

Загадки—шутки.

XIX. Какая станция не что иное, как религиозный предрассудок?

XX. Какая река имеет когти?

XXI. Какую станцию можно повесить на шею?

XXII. Какая станция окружена со всех сторон водою?

— Какую букву нужно вставить в «у», чтобы получить название высшего учебного заведения?

ЗАГАДКИ-ШУТКИ: VII клен — лен; VIII—ельмель. Решили т.т. Львов, Баранкевич, Соколовский, Каган, Гапонович, Буяновер, Каменецкая, Комар, Лапицкая, Голубовский.

В № 63 „Чырв. Зьмены".

РЕБУС: «За экономию и качество». Решили т.т. Лобич, Бурсов, Русинов, Флакс, Фадеев, Линич, Живица.

Задача букв.

- - - О О-О- -Е-Е- -О О-ЫЙ-У-.

Вместо черточек, проставь соответствующие согласные буквы так, чтобы в результате можно было прочесть пословицу или, вернее, «заповедь» физкультурника.

О личной жизни.

(Почти маленький фельетон).

.. Личная жизнь партийца и комсомольца—это дело партии, комсомола, дело всех трудящихся.

«Коровьковщина не является частным делом»—говорит тов. Сосновский, «...но никто не сделал это предметом обсуждения».

У нас, в партии и в комсомоле, существует система индивидуальных отчетов членов и кандидатов партии и комсомола.

Хорошо и правильно использованный метод может и уже имеет свои положительные стороны коллективного воспитания, оценки и т. д.

Но послушайте, до чего докатились некоторые ячейки комсомола.

Собралась ячейка ЛКСМБ Лядовского района, Оршанского округа, местечка Блево и...

Слушали. 1. Отчет о **личной жизни** т. Воронцовой.

И

постановили:

«Заслушав отчет о личной жизни т. Воронцовой, постановили уничтожить пылкость и ругетню».

Потом дальше!

«Заслушав отчет т. Н., постановили: авторитет имеет».

А вот эта ячейка, уже более производственная, серьезная и т. д., дает нам такой документик:

Слушали	Постановили
Индивидуальный отчет тов. Някина, который обрисовал подробно свою биографию, общ. работу проф. и комсомольскую.	Жизнь т. Някина считать нормальной.

Навряд-ли кто нибудь так понимает индивидуальные отчеты, навряд ли кто нибудь думал превратить их в исповеди, чтобы получить патент на «нормальную жизнь» или отметить «авторитет имеет».

Метод индивидуальных отчетов — бесспорно хорош. Нужно только его правильно понять.

Путем заслушивания индивид. отчетов ячейка может и должна более детально и подробнее вынести постановление по отчету, как это правильно делают другие. Вот пример.

«Заслушав доклад т. К. ячейка находит, что т. К. будучи сознательным комсомольцем недостаточно регулярно читает газеты, довольно часто пропускает занятия политшколы и содержит свою комнату в беспорядке а потому предлагает ему поправить эти недостатки и через 2 месяца вторично отчитаться перед общим собранием».

Только так нужно понимать индивидуальные отчеты.

Б. РОД.

Да ведама чытачоў.

Рэдакцыя «Ч З.» з гэтага часу пашырае аддзел „Запытаньні і адказы» і абвяшчае сваім чытачом аб тым, што ўсе справкі па зададзеным запытаньням, а так сама здача запытаньняў для Менскіх чытачоў дзеюцца і прымаюцца ў памяшканьні рэдакцыі «Чырв. Зьмены» тры разы у тыдзень: па панядзелкам, чацьвяргам і субатам ад 11 да 1 часу дню.

Да іншагародніх чытачоў рэдакцыя зварачваецца з просьбай, каб на левай староне канвэрту, у якім пасылаецца запытаньне, была ясна надпісана «Запытаньні».

Рэдакцыя таксама наладжвае з гэтага часу пісьмовую сувязь з чытачамі, прысылаючымі запытаньні, дзеля чаго просіць на кожным лістку пісаць свой падрабязговы адрас.

Маючы на ўвазе, што рэдакцыя загружана запытаньнямі, з гэтага часу адказы будуць давацца ў першую чаргу падпішчыкам «Чырвонай Зьмены». Дзеля гэтага трэба пад кожным запытаньнем зазначыць нумар падпіснога квітка.

У адным з чарговых нумароў «Ч З.» рэдакцыя зьмесьціць інструктыўны допіс аб тым, як задаваць запытаньні, каб атрымаць падрабязговы і сталы адказ.

Сачыце за «Чырвонай Заменай»!

Рэдакцыя «Чырв. Зьмены».

Наука и техника.

„Пища без огня".

Мы еще до сих пор привыкли смотреть на пищу, как на топливо, подкладываемое в животный организм. Поэтому-то наука определяла достоинство той или иной пищи по калориям, т.-е. по тому количеству тепла, которое эта пища выделяет.

От этого взгляда пора отказаться. Новая теория витаминов (особых веществ, содержащихся в растительной пище) указывает, что человеческому организму важно не только тепло. Отсутствие витаминов приводит к тяжким болезням. Человек должен поглощать определенную порцию этих веществ, природа которых еще подробно не изучена, чтобы сохранить здоровье и силы.

Изучить эти витамины, добыть их в чистом виде,—является важнейшим вопросом современной физиологии. Англия и скандинавские страны настолько оценили присутствие витаминов в пище, что они употребляют также «пищу без огня». Блюда приготовляются из холодных овощей, чтобы не производить варкой варварского уничтожения необходимых организму веществ.

Необыкновенный автомобиль.

Изумительный по своему строению автомобиль показывался недавно в Чикаго. С помощью легко приводимых в действие механизмов и частей, без труда прикрепляемых и снимаемых, этот автомобиль может играть по желанию владельца роль легкого пассажирского автомобиля на пять человек, грузовика на полторы тонны (тонна равна 62 пуд.), снегового плуга для очистки снега и грязи, брызгателя для промывки асфальтовой мостовой и, наконец, он м. б. пожарным, так как его мотор имеет достаточно силы, чтобы подать сильную струю воды на высоту четырех этажей.

Самый длиный телефонный кабель в мире.

В ноябре закончена была, продолжавшаяся почти 7 лет, прокладка телефонного кабеля между Нью-Йорком и Чикаго. Кабель этот, самый длинный из всех телефонных кабелей в мире, имеет 1.386 кил. в длину.

Шах-шашечная хроника.

Закончились турниры в 4-ой школе. В шашечном турнире первое место взял Тресман, а второе Вайштейн.

Шахматный турнир 2-ой школы закончился победой—1. Мазеля, 2. Настюшенка и 3—Хиггеровича.

28 мая состоялся шахматно-шашечный вечер юнсекции Рабпроса. Т. Зибецкер играл одновременно 12 шашечных партий, из которых он выиграл 10, проиграл 1 и одну свел в ничью.

Шахматный сеанс т. Романовского закончился со счетом +6—4=2.

В клубе кустарей начался шахматный турнир. Участвуют 18 человек. Теоретическими занятиями руководит Г. Кейлес.

Юмор.

Борьба за качество.

— И что же это за глиняные горшки в нашем кооперативе? Качество ни к чорту!

— Почему?

— Да вот, вчера запустил горшок в жену, а он на кусочки и разлетелся.

С подходом.

— Чего, Петька, кулич жрешь?

А комсомолец...

— Мать дюже верующая, особого подхода требовает...

В старой школе.

Ответил.

УЧИТЕЛЬ: Чем достопримечательна Сахара?

УЧЕНИК: Тем, что в ней много сахару.

УЧИТЕЛЬ: Какой же сахар, когда там песок?

УЧЕНИК: Вот я и говорю,—сахарный песок.

Сходство.

— Какое сходство между президиумом и смазливой девчонкой на собрании?

— И тому, и другой—посылают записочки...

Тождество.

— На нашем собрании секретарь не дает рта открыть,—ругается.

— А тебе хотелось речь сказать?

— Н-е-е-т, спать я хотел, зевал.

ПИСЬМО В РЕДАКЦИЮ.

Уважаемый тов редактор!

В № 67 (302) «Чырвонай Зьмены», от 11 июня с. г., был помещен мой фельетон «Курган и юность».

Некоторые товарищи могут неправильно понять мысль этого фельетона в том месте, где я обращаюсь с призывом изучать памятники старины («Юность, на курганы»).

Безусловно, я мыслю себе изучение молодежью прошлого нашего края, как участие ее в научных экспедициях, организуемых государственными организациями, а ни в коем случае, как самостоятельное занятие.

Кроме того, должен сказать, что я вовсе не хотел в своем фельетоне охватить всю громадную тему работы по краеведчеству. Работа по изучению и охране памятников старины, которой я коснулся является только второстепенной.

Моим фельетоном, вообще, я хотел обратить внимание широких масс комсомольской организации на то, что нужно более внимательно относиться к историческому прошлому Белоруссии, не только любить, но и изучать.

М. Гольдберг.

Утерянные документы.

Утерян членский билет ЛКСМБ № 19123 на имя ЧЕПИКА КУЗЬМЫ. Считать недействительным.

„У адзінаццаты раз напамінаць".

Магілеўскім акружкомам комсамолу было атрымана гэткае аднашэньне: „Пры гэтым праваджаецца анкета на зацьверджанага комсамольца Шапялевіцкай ячэйкі—тав. Тарасевіча для занясеньні картачкі і высылкі сяброўскага білету. Побач з гэтым Бялыніцкі РК павядамляе акружкамол, што за гэтакія штукі Зорыч можа напісаць фэльетон і атрымаць за гэта гонарар—адзін выдатак. Другі выдатак тое, што з аднога імя па бацьку (ці так гэта? В. В.) Вы патрацілі на маркі, а ў сучасны момант патрацілі мы, а затым ізноў, усяго—выдатак 32 кап. Сакратар РК КСМ Нізоўцаў! Тав. Нізоўцаў можа накіроўваць свой матар'ял да Зорыча, ніхто Вам у гэтым запрэту не кладзе Няхай ён напіша фэльетон, а пакуль мне дазвольце стаць „Зорычам" і на хвіліну захапіць яго функцыі.

У чым тут справа? Бялыніцкі райкамол прысылае анкету на ўноў уступаючага камсамольца. У анкеце значыцца Тарасевіч Петр—імя па бацьку няма. Ці мала ў нас такіх Тарасевічаў у Шапялевіцкай ячэйцы? Селянін ён ці хто, бядняк, ці серадняк не паказана. Пастановы райкому—няма, зацьверджан ці не зацьверджан—нявядома.

Вучотны статыстычны пададзел піша Бялыніцкаму райкамолу: «Ўзварачаецца анкета Тарасевіча Петра і ў 10-й раз тлумачыцца, што анкеты павінна запоўняць поўносьцю і пісаць ясна".

Як быццам усё і проста. Звычайная перапіска. А выходзіць ня тое. Вялыніцкі райкамол вельмі добра ўсвоіў дырэктыву партыі, па пытаньні аб рэжыму экономіі і тут правёў „просьценькі" падлік: 32 кап. за маркі, а да гэтага плюс будучы гонарар, які атрымае Зорыч за фэльетон. Ці гэта экономія?... Ці гэта зьберажэньне савецкай капейкі? За адно слова „імя па бацьку" згубіць: 32 кап. і плюс гонарар".

Тое, што райкамол мысьліць аб рэжыме экономіі — за гэта іх можна пахваліць.

Але чаму таварыш Нізоўцаў не падумаў!—што анкета неафармленая райкамолам можа ў АК праваляцца 3 4 месяцы. Яе-б ніхто не заносіў у сьпіскі і ніхто-б ня выслаў сяброўскага білету. І ў той час на пленуму АК сам тав. Нізоўцаў (і в суе с нім) пачалі бы крычаць: „бюрократызм, валакіта, не зацьвярджаюць і білету ня прысылаюць".

Гэта значыць, вучотна-статыстычны пададдзел правільна зрабіў, калі своечасова адаслаў анкету для афармленьня Райкамол-жа з за халатнасьці і неуважлівасьці да ўказаньняў акружкамолу сам садзейнічае стварэньню непатрэбнай валакіты.

Вучотна - статыстычны пададдзел наш абвінавачваць ня прыходзіцца (на беднага Макара і так усе шышкі валяцца); райкамолу ў 11-й раз трэба напомніць, але ўжо словамі з басьні Крылова: „Чем кумушек считать трудиться, не лучше-ль кума на себя оборотиться".

ВОІНАЎ.

Ответственные редактори: А. БАРАННИКОВ. А. КУРТИК

Главлитбел № 18234 Минск, 2-я типография БГИ.